УДК 75.038.6“19”–028.22

# МЕТАФАРЫЧНЫЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ВОБРАЗНЫХ КАНЦЭПТАЎ У ЖЫВАПІСЕ XX СТАГОДДЗЯ

***Цыбульскі М.Л.***
*Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава ”, Віцебск*

*У артыкуле ўдакладняецца паняцце “метафара”, разглядаюцца сродкі яе сэнсаўтварэння ў мастацтве XX стагоддзя. Аўтар аналізуе метафару і асаблівасці яе функцыянавання ў мастацкім дыскурсе, вызначае яе месца ў сістэме вобразных сродкаў выяўленчага мастацтва, разглядае метафару як катэгорыю фарміравання мастацкай вобразнасці ў жывапісе. Вызначаюцца асноўныя тэндэнцыі ў развіцці выяўленчай метафары, асноўныя мадэлі метафар у жывапісе XX стагоддзя і іх роля ў рэпрэзентацыі вобразных канцэптаў. У кантэксце працэсаў метафарызацыі даследчык характэрызуе некаторыя дамінантныя канцэпты адлюстравання мастацкай карціны свету.*

*Метафарызацыя – агульная з’ява, якая адыгрывае важную ролю ў сферы творчага мыслення, візуальных мастацтвах. Шэраг кірункаў пачатку XX стагоддзя можна разглядаць як прыклад узаемадзеяння свядомасці мастака з метафарай. Апошняя адыгрывае важную ролю ў паэтыцы мадэрнізму, дзе цэнтральная ўвага засяроджана на пластычнай выразнасці візуальнай метафары. Пластычная метафара, ці не галоўны прынцып мастацтва мадэрнізму, які рэалізуецца праз кампазіцыю, колер, каларыт, танальныя адносіны, рытм, перспектыву і г.д. Надзвычай важнае месца метафара займае і ў кантэксце мастацтва постмадэрнізму. Нярэдка гэта злучана з прамым зваротам мастакоў да вобразаў з вядомых міфаў, легенд, паданняў, якія страчваюць першапачатковы сэнс і набываюць новы, сугучны сучаснасці. Важную ролю ва ўкараненні метафары ў творы жывапісу адыграў калаж, прынцып стварэння якога дапамагаў рабіць гэта асабліва выразна.*

***Ключавыя словы:*** *метафара, выяўленчая метафара, візуальная метафара, спосабы метафарызацыі, жывапіс XX стагоддзя, мадэрнізм, постмадэрнізм.*

*(Искусство и культура. – 2020. – № 3(39). – С. 30–34)*

# METAPHORIC PRESENTATIONS OF IMAGE CONCEPTS IN THE XX CENTURY PAINTING

***Tsybulski M.L.***
*Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”, Vitebsk*

*The article specifies the concepts of the metaphor; ways of its sense creation in the 20th century art are considered. The author analyzes the metaphor and features of its functioning in art discourse, identifies its place in the system of image means of fine arts, considers metaphor as a category of shaping art image in painting. Basic trends in the development of the art metaphor are singled out as well as main metaphor models in the 20th century painting and their role in presenting image concepts. In the context of metaphorization processes the author characterizes some dominant concepts of depicting the art picture of the world.*

*Metaphorization is a general phenomenon which plays a significant role in the sphere of art thinking, visual arts. A number of the early 20th century trends can be considered as an example of the interconnection of the artist’s consciousness with the metaphor. The latter plays an important role in the Modern poetics where main attention is paid to plastic expressiveness of the visual metaphor. Plastic metaphor is in fact the main principle of the art of Modern which is implemented through composition, color, coloring, tone relations, rhythm, prospect etc. The metaphor takes an extremely important place in the context of the Post Modern art as well. It is often connected with the direct painters’ addressing the images of well-known myths, legends, tales which build the original sense and acquire the new contemporary one. An important role in rooting the metaphor into the piece of painting is played by the collage, the principle of creating of which helped to make it especially expressively.*

***Key words:*** *metaphor, metaphor in painting, visual metaphor, ways of metaphorization, 20th century painting, Modern, Post Modern.*

*(Art and Cultur. – 2020. – № 3(39). – P. 30–34)*

*Адрас для карэспандэнцыі: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

Репозиторий ВГУ

XX стагоддзе шмат у чым з’явілася новай якаснай мяжой ў развіцці мастацтва, адначасова прадэманстраваўшы свету новыя спосабы яго спазнання і апісання. Як і ўсялякі іншы гістарычны этап ён сфарміраваў у мастацтве свае метафары. Вядома, што метафара з’яўлялася істотнай часцінай мовы і мыслення людзей з найстаражытнейшых часоў і заўсёды была адным са спосабаў адлюстравання сутнасці часу. Невыпадкова Ф. Ніцшэ адзначаў, што пазнанне ў прынцыпе метафарычна. Сапраўды, сучасны чалавек “вырастае сярод метафар” і ўспрымае свет праз пэўны “метафарычны вэлюм (вуаль)” [1, с. 37].

Метафара ў мінулым стагоддзі не толькі актыўна ўдзельнічала ў фарміраванні індывідуальных мадэляў светаўспрыняцця творцаў, але адыграла і важную ролю ў стварэнні мастацкіх вобразаў. Нароўні з макраметафарамі ў канструяванні шматграннага вобраза часу ў мастацтве значнае месца належыла самым разнастайным яе канцэптуальным формам, якія “абапіраліся на традыцыйныя для дадзенага грамадства паняцці і правілы” [2, p. 12]. Менавіта шматузроўневасць і шматаспектнасць метафар у паэтыцы мастацтва XX стагоддзя надалі яму асаблівую прыцягальнасць для гледача.

Сапраўды, у мастацтве “метафара не проста прысутнічае, яна тут валадарыць, яна складае саму яго сутнасць, паколькі мастацтва вобразна адлюстроўвае рэальнасць”. Метафара і яе канатацыі “служаць для стварэння кампазіцыйнага і сэнсавага адзінства твора” [3], дапамагаюць ствараць новыя сэнсы. Відавочна, што перспектыўным для даследавання выяўленчага мастацтва мінулага стагоддзя ўяўляецца аналіз ролі метафары ў мадэліраванні мастацкіх вобразаў.

Мэта артыкула – даследаванне сутнасці метафары, вызначэнне яе месца і асноўных уласцівасцяў у сістэме вобразных сродкаў выяўленчага мастацтва, аналіз метафары як катэгорыі фарміравання мастацкай вобразнасці ў жывапісе, выяўленне ролі асноўных метафарычных мадэляў у рэпрэзентацыі вобразных канцэптаў у жывапісе XX стагоддзя.

**Метафара як аб’ект даследавання і асноўныя аспекты яе вывучэння.** Сёння нават у лінгвістыцы адсутнічае адзінае разуменне феномену метафары, што пацвярджае неадназначнасць яе трактоўкі ў навуковых даследаваннях апошніх гадоў [4]. Аднак, пры ўсёй разнастайнасці тлумачэнняў метафары, усе яны ўзыходзяць да арыстоцелеўскага вызначэння. У большасці сучасных лінгвістычных слоўнікаў і энцыклапедый метафара падаецца як троп ці від тропа, сутнасць якога ва ўжыванні слоў і выразаў у пераносным сэнсе на падставе падабенства, аналогіі (радзей – кантраста з’яў), што закладзена ў самой этымалогіі слова. Фокус метафары (тэрмін М. Блэка) [5], ці метафарычнае слова (выраз) служыць для перадачы сэнсу, які, па сутнасці, мог бы быць выяўлены літаральна. Метафара працуе на катэгарыяльным узроўні і таму гаворка ідзе аб тым, што яна вылучае і падкрэслівае вызначаную агульную прыкмету адразу дзвюх рэчаў. Такая двупланавасць метафар стварае своеасаблівую гульню дзвюх прастор, двух вобразных значэнняў. Ад іх семантычнага дыялогу залежыць выразнасць метафары. У балансаванні паміж умоўнасцю і дакладнасцю, сказаным і невымоўным, паміж пэўнасцю і нявызначанасцю і заключаецца яе сіла .

Метафара – гэта, перш за ўсё, спосаб зрабіць так, каб абстрактнае ўспрымалася лягчэй, магчымасць падкрэсліць індывідуальнасць і непаўторнасць канкрэтнага прадмета або з’явы. Нягледзячы на сваю лаканічнасць, метафара прымушае нас разважаць, але ніколі не раскрывае ўсяго спектра магчымых значэнняў. Мера падабенства для метафары не істотная. Пры гэтым, як стварэнне, так і разуменне метафары ёсць вынік творчых намаганняў, для якіх не існуе межаў і правілаў. Менавіта таму метафарычнае выказванне можа мець шмат інтэрпрэтацый у залежнасці ад кантэксту.

Магчыма таму англійскі даследчык А. Рычардэ вызначае метафару не як вынік замяшчэння аднаго слова іншым, а як “узаемадзеянне ідэй” [6]. У сваёй тэорыі вялікае значэнне ён надае паняццю напружанасці, якая ўзнікае паміж “зместам” і “абалонкай” метафары. “Абалонка”, на яго думку, не з’яўляецца простым ўпрыгожваннем “зместу”. У іх узаемадзеянні нараджаецца значна багацейшая сутнасць, чым тая, што дае кожны з гэтых кампанентаў, узяты паасобку. Метафара “заклікана ствараць новы сэнс, павінна валодаць сугестыўнасцю” лічыць аўтар кагнітыўнай тэорыі метафары Э. Макармак [7, с. 359]. Сапраўды, характэрная рыса добрай метафары – яе навізна. У кантэксце “філасофіі метафары” Г. Блюменберга метафара мае месца там, дзе яшчэ няма магчымасці для ўтварэння паняццяў [8].

У сваю чаргу амерыканскі даследчык Макс Блэк адзначае, што ў аснове метафарычнага працэсу ляжыць узаемадзеянне не рэчаў, а сістэм рэчаў. Ён сцвярджае, што метафара не пераносіць прыкметы ці ўласцівасці аднаго прадмета на іншы, а прымушае ўзаемадзейнічаць гэтыя прадметы, ствараючы нейкі новы сэнсавы аб’ект. Пры гэтым больш правільна было б казаць, што “метафара менавіта стварае, а не выяўляе падабенства” [5].



Рэпазіторый ВДУ

У сучаснай тэорыі метафары даволі часта прыгадваюцца “канцэптуальныя прасторы”,ці канцэпты. Калі больш ўважліва прыглядацца да таго, што робіць метафара, то мы заўважым, што яна супастаўляе не два прадметы, але хутчэй дзве сістэмы паняццяў, якія адпавядаюць розным галінам досведу – гэта і ёсць канцэпты, ці канцэптуальныя прасторы [3, с. 40–41]. Акрамя таго далёка не заўсёды метафара супастаўляе толькі два канцэпты. Складаная метафара можа змешваць некалькі канцэптуальных прастораў. Створаныя метафарай новыя канцэпты змяшчаюць у сабе лагічныя сутнасці рознага парадку, сінтэзуюць абстрактнае і канкрэтнае.

У апошні час паняцце “метафара” выкарыстоўваецца даволі шырока для абазначэння любога метафарычнага пераносу і ўсё больш навукоўцаў лічаць, што погляд на метафару толькі як на стылістычны сродак, або як на сродак папаўнення лексічнага, ці фразеалагічнага інвентара мовы не вызначае ўсіх выпадкаў функцыянавання метафары. У агульным кантэксце ролю метафары немагчыма пераацаніць, яна мае ўніверсальны характар, і прысутнічае паўсюдна ў чалавечым жыцці.

Безумоўна, метафара займае значнае месца ў творчым мысленні. Творчасць і мастацтва немагчымыя без метафар, паколькі паняційная сістэма, у межах якой мы жывём, метафарычная па сваёй сутнасці. Так ці інакш і ў мінулым стагоддзі па-ранейшаму актуальным заставалася тое, аб чым казаў яшчэ Арыстоцель: “Важней за ўсё – быць майстрам у метафарах”, падкрэсліваючы, што “гэта нельга пераняць ад іншага; гэта – прыкмета таленту” [9].

**Ступень навуковай распрацаванасці праблемы і сучасны стан метафаралогіі.** Феномен метафары здаўна прыцягваў да сябе ўвагу даследчыкаў, сярод якіх не толькі прадстаўнікі літаратуразнаўства і навук, але і злучаных з вывучэннем метафары як атрыбута мовы. Асаблівая цікавасць даследчыкаў да метафары ў XX ст. звязана з фарміраваннем кагнітыўнай навукі, у рэчышчы якой метафара паўстала як феномен свядомасці, спосаб асэнсавання свету. Вывучэнне метафары хутка пашыраецца, захопліваючы розныя галіны ведаў – філасофію, логіку, семіётыку, рыторыку і інш. Пачынаючы з 1960-х гадоў ад трактоўкі метафар як важнага і спецыфічнага элемента мовы даследчыкі пераходзяць да разумення іх фундаментальнасці і ўніверсальнасці [10].

На сучасным этапе вывучэнне метафары носіць міждысцыплінарны характар, фундаментальная навука выходзіць на новы этап ўсведамлення яе сутнасці. Гэта і не дзіўна, бо метафара ў сучасным разуменні з’яўляецца адным з ключавых элементаў ўзаемадзеяння мовы, мыслення і ўспрымання, паўстае як асноўнае звяно ў засваенні і перадачы ведаў, адлюстроўвае адзін з механізмаў канцэптуалізацыі свету. Адмысловую значнасць для мастацтвазнаўства ўяўляе асэнсаванне метафары як ключавога элемента мастацкай мовы, мыслення мастака, выяўленне філасофска-пазнавальнага патэнцыялу метафары, а таксама яе сэнсаутваральнай ролі ў сучасным мастацтве. Да таго ж, метафара становіцца своеасаблівым ключом да ўсведамлення асаблівасцяў нацыянальнай спецыфікі бачання свету.

Вынікам шматлікіх даследаванняў стала стварэнне вялікай колькасці розных тэорый метафары. У залежнасці ад таго, які з аспектаў метафары знаходзіцца ў цэнтры ўвагі даследчыка, вызначаецца той ці іншы падыход да аналіза яе сутнасці. Асобныя аспекты праблемы метафарызацыі мастацкіх вобразаў сустракаюцца ў артыкулах шэрага мастацтвазнаўцаў. Але спецыяльных і грунтоўных даследаванняў тэорыі і практыкі выкарыстання метафары ў галіне выяўленчага мастацтва нам знайсці не ўдалося. Тым не менш, даволі сістэмнае даследаванне метафарычнасці на матэрыяле сучаснага беларускага жывапісу належыць маладой беларускай даследчыцы Наталлі Даршаковай, якая прысвяціла выяўленчай метафары сваю магістарскую дысертацыю і апублікавала на гэту тэму некалькі артыкулаў [11].

**Метафара ў жывапісе як форма вобразнасці, эксплікацыі ідэй і канцэптаў.** Не спрабуючы ўраўніваць візуальнае і вербальнае мысленне, як гэта зрабіў французскі філосаф М. Мерло-Панці [12], адзначым, што яны маюць шмат агульнага. Сапраўды, метафары ў жывапісе хоць і немагчыма лічыць аналагам вербальных, але разам з тым яны шмат у чым падобныя. А таму наўрад ці можна пагадзіцца з Н. Аруцюнавай, якая лічыць, што выяўленчая метафара радыкальна адрозніваецца ад метафары славеснай: паколькі “яна не спараджае ні новых сэнсаў, ні новых сэнсавых нюансаў, яна не выходзіць за межы свайго кантэксту і не стабілізуецца ў мове жывапісу або кіно, у яе няма перспектыў для жыцця па-за межамі таго твора мастацтва, у які яна ўваходзіць. Сам механізм стварэння выяўленчай метафары глыбока адрозніваецца ад механізму славеснай метафары, абавязковай умовай дзеяння якога з’яўляецца прыналежнасць да розных катэгорый двух яе суб’ектаў – асноўнага і дапаможнага”. (...) “Гэта не больш чым вобраз, які ў тым ці іншым мастацкім кантэксце набывае сімвалічную (ключавую) значнасць, больш шырокі, абагульняючы сэнс” [13].

Візуальная метафара – гэта заўсёды загадка для гледача. Часта ў ёй спалучаецца

Рэпазіторый БДУ

неспалучаемае, што адмяняе звыклы ход ўспрымання. Расшыфроўка візуальнай метафары, безумоўна, важная частка яе асэнсавання. Але метафара не дзеліцца на асобныя элементы, яе немагчыма "разабраць" без страты закладзеных у яе шматлікіх сэнсаў, што пераплецены паміж сабой. Калі вербальная метафара можа быць адлюстравана ў візуальным плане і распазнана, то візуальная метафара нярэдка з'яўляецца больш складанай для яе моўнага "прачытання".

Метафары дапамагаюць мастаку адлюстраваць яго ўяўленні пра свет. У жывапісе метафарычны вобраз – гэта яшчэ і спосаб, форма адлюстравання выяўленчага матыву, аб'екта, падзеі. Выкарыстанне метафарычных канструкцый узмацняе эмацыянальную і сэнсавую выразнасць вобраза. Дзякуючы сваёй высокай інфарматыўнасці метафара з'яўляецца адной з форм рэпрэзентацыі канцэпту. Як для мастака, так і для гледача важная не столькі праўдзівасць тых ці іншых асацыяцый, колькі іх хуткая актывацыя ў свядомасці.

У творах мастакоў метафары ўзнікаюць у выніку ўзаемадзеяння ідэй, думак, якія па сваёй сутнасці метафарычныя. Невыпадкова яшчэ Артэга-і-Гасэт адзначаў, што "метафара служыць той прыладай думкі, пры дапамозе якой нам удаецца дасягнуць самых аддаленых участкаў нашага канцэптуальнага поля... " [14]. Пры гэтым, як адзначае той жа аўтар, метафара – гэта ледзь не адзіны спосаб вызначыць аб'екты высокай абстракцыі.

У гісторыі выяўленчага мастацтва вядомыя метафары, якія ўвайшлі ў яго пантэон у мностве формаў і сталі базавымі, каранёвымі метафарамі. Яны натхняюць творцаў і рэцэпіентаў на мноства эмацыйных, ці творчых аналогій, але ніколі не вычэрпваюцца імі. Выкарыстанне метафар характарызуе пэўную манеру фарміравання вобразнасці, якую той ці іншы аўтар выкарыстоўвае для адлюстравання свайго светапогляду. Аналізуючы яе, магчыма вызначыць агульныя канстанты аўтарскіх канцэптаў (філасофскіх, эмацыянальных, тэмпаральных і інш). Аднак існуе і такое выражэнне – "аўтарская метафара", якая часам выходзіць за межы агульнавядомай прасторы метафарычнага мыслення і гучыць у пэўным аўтарскім мастацкім кантэксце. У падобных метафарах праяўляюцца і нацыянальныя асаблівасці, уласцівыя творчасці таго ці іншага мастака.

Вялікае мноства аўтарскіх метафарычных мадэляў, па сутнасці, канстатуе прастору мастацтва XX стагоддзя, утварае сістэму пераносных значэнняў, якія не толькі функцыянуюць як вобразна-семантычныя адзінкі, але і ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Задачай метафары ў мастацкім творы з'яўляецца стварэнне шматузроўневага сэнсу, які нараджаецца дзякуючы ўздзеянню метафарычнага поля на ўсе элементы вобразнасці. Выкарыстанне розных відаў метафар узбагачае яе, пазбаўляе творы мастака ад стэрэатыпных вобразных канструкцый. З вышэйадзначаным звязаны і функцыі, якія выконвае метафара ў творах выяўленчага мастацтва. Важнымі з іх, на наш погляд, з'яўляюцца вобразна-сэнсавая, канцэптуальная, асацыятыўная, гульнявая і жанраўтваральная.

У сучаснай тэорыі метафары падзел яе на тыпы залежыць ад таго, з якіх пазіцый разглядаецца гэта з'ява. Нельга не пагадзіцца з тым, што большасць класіфікацый хутчэй за ўсё мае "прамежкавы характар", паколькі ў іх адсутнічае адзіны, выразна пазначаны класіфікацыйны крытэрый [15, s. 82]. Многія даследчыкі выдзяляюць дамінантныя, "каранёвыя", базісныя метафары, падкрэсліваючы, што іх існуе неабмежаванае мноства, а таксама надзелены яны сэнсамі і асацыяцыямі, якія дапускаюць амбівалентнасць трактоўкі [7]. Гэтыя ўніверсальныя канцэптуальныя метафары чалавек засвойвае з нараджэння і захоўвае ў свядомасці ўсё жыццё.

**Метафара ў кантэксце гістарычнай паэтыкі.** "У XX стагоддзі метафара ўсё больш настойліва ўвязваецца з праблемай самаідэнтыфікацыі свядомасці, што вядзе да высвятлення яе глабальнага значэння..." [16]. Шэраг кірункаў пачатку XX стагоддзя можна разглядаць як прыклад узаемадзеяння свядомасці мастака з метафарай, якая адыгрывае важную ролю ў паэтыцы мадэрнізму, дэманструючы пры гэтым шырокі і стракаты дыяпазон праяў выкарыстання метафары, разнастайнасць і зменлівасць карціны свету, адлюстраванай з яе дапамогай у мастацкіх вобразах. У мадэрнізме цэнтральная ўвага мастакоў засяроджана на пластычнай выразнасці візуальнай метафары. Многія мастакі ў пачатку XX стагоддзя абстрагуюцца ад рэальнасці, шукаюць альтэрнатыў у пластычна неардынарных метафарычных формах і аўтарскіх вобразных канструкцыях. Пластычная метафара, ці не галоўны прынцып мастацтва мадэрнізму, які рэалізуецца праз кампазіцыю, колер, каларыт, танальныя адносіны, рытм, перспектыву і г.д.

Мадэрнісцкай шматузроўневай метафары ўласцівыя татальнасць і быційная мадальнасць. У многіх творах жывапісу пачатку XX стагоддзя метафары вельмі яркія і моцныя як, напрыклад, у прадстаўнікоў сюрэалізму і экспрэсіянізму. "Экспрэсіянізм пачатку XX стагоддзя можна разглядаць як прыватны выпадак стылю, які

Рэпазіторый ВДУ

абапіраецца на «працу» свядомасці з метафарай у дачыненні да ўсіх элементаў і ўзроўняў гэтага жывапісу” [17]. Ды і рэалістычнае мастацтва ў фарміраванні мастацкіх вобразаў ніколі не было пазбаўлена метафарычнасці, розных відаў іншасказанняў. У творах прадстаўнікоў так званага сацыялістычнага рэалізму нярэдка таксама прысутнічае даволі высокі ўзровень метафарызацыі як у кампазіцыях, прысвечаных рэвалюцыі і вайне, так і ў побытавых сцэнах.

Калі ў мастацтве першай паловы стагоддзя творцы часам несвядома абапіраюцца на метафару, то ў другой яго палове яны робяць гэта асэнсавана і дакладна пралічана. У кантэксце мастацтва постмадэрнізму метафара займае надзвычай важнае месца. Нярэдка гэта злучана з прамым зваротам да вобразаў з вядомых міфаў, легенд, паданняў, якія страчваюць першапачатковы сэнс і набываюць новы, сугучны сучаснасці. Мастак не ілюструе іх, але стварае свой уласны свет вобразаў. Шмат у чым гэта было абумоўлена цікавасцю мастакоў не да эмпірычнай рэальнасці, а да сканструяванай самім мастаком вобразнасці. Важную ролю ва ўкараненні метафары ў творы жывапісу гэтага часу адыграў калаж, прынцып стварэння якога дапамагаў рабіць гэта асабліва выразна. Інтэрпрэтацыя тэм і вобразаў сусветнавядомых твораў таксама не пазбаўлена метафарычных канструкцый.

Метафарычная тэма жывапіснага твора часцей за ўсё фіксуецца ў назве палатна, і пры гэтым надае руху асацыяцый пэўны кірунак. Гэта ўласціва не толькі творам сюжэтнага жывапісу, але і кампазіцыям, у якіх прысутнічае тая ці іншая тэма і ўвогуле фігуратыўнасць. Тэма выводзіць нас за межы адлюстраванага, патрабуючы развіцця, адлюстроўваючы кульмінацыйны момант, у якім схаваны закладзены аўтарам метафарычны сэнс.

**Заключэнне.** У кантэксце інтэграцыйнай накіраванасці сучаснага навуковага мыслення метафара сёння набыла права быць аб’ектам не толькі філалагічных інтарэсаў, яе комплекснае вывучэнне абумовіла блізкую верагоднасць фарміравання самастойнай дысцыпліны – метафаралогіі і актывізацыі даследчых намаганняў у розных яе галінах, у тым ліку і мастацтвазнаўстве. Сапраўды, метафарызацыя – агульная з'ява, якая адыгрывае важную ролю ў сферы творчага мыслення, візуальных мастацтвах, увогуле, у розных дыскурсах. “Метафара ў гэтым сэнсе – адзін з унутраных інтэгравальных механізмаў, якія аб'ядноўваюць увесь комплекс чалавечай свядомасці, і ў першую чаргу, гэта датычыцца той яго сферы, якая абслугоўвае творчую дзейнасць ” [18, с. 81]. Відавочна, што метафары з’яўляюцца неад’емным інструментам творчасці, уздзейнічаюць на ўспрыняцце свету і спосабы яго ўсведамлення, уплываюць на фарміраванне новых вобразаў. Без метафары немагчыма ні сапраўдная творчасць, ні вольнае мысленне, чым абумоўлена шматпланавасць выражэння метафары ў мастацтвазнаўчым дыскурсе.

Метафарычны ландшафт мастацтва ўвесь час змяняецца, павялічваецца колькасць метафарычных канструкцый, якія мастакі выкарыстоўваюць для выражэння сваіх ідэй, метафарычнаму пераасэнсаванню падвяргаюцца ўсе новыя вобразы. А таму выяўленне асаблівасцей функцыянавання розных відаў метафар у канкрэтных творах мастакоў заўжды будзе заставацца перспектыўным для новых пакаленняў мастацтвазнаўцаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Лагута, О.Н. Метафорология: Теоретические аспекты / О.Н. Лагута. – Новосибирск: Новосиб. гос. ун-т, 2003. – Ч. 1. – 114 с.
2. Charteris-Black, J. Corpus approaches to critical metaphor analysis / J. Charteris-Black. – Palgrave-MacMillan, 2004. – 278 p.
3. Уфимцев, Р. Хвост ящерки. Метафизика метафоры / Р. Уфимцев. – Калининград: Изд-во «Оттокар», 2010. – 295 с.
4. Жуков, О.Р. Дефиниция и словарная статья термина Метафора / О.Р. Жуков // Известия высших учебных заведений. Поволжский регион. Гуманитарные науки. – 2015. – № 2(34). – С. 92–102.
5. Black, M. Models and Metaphors: Studies in Language and Philosophy / M. Black. – Cornell University Press. Ithaca. – NY. – 1962. – 267 p.
6. Ричардс, А. Философия риторики / А. Ричардс // Теория метафоры: сборник / пер. с англ., фр., исп., польск. яз. / вст. ст. и сост. Н.Д. Арутюновой; под общ. ред. Н.Д. Арутюновой и М. Журинской. – М.: Прогресс, 1990. – С. 44–67.
7. Мак Кормак, Э. Когнитивная теория метафоры / Э. Мак Кормак // Теория метафоры: сборник / пер. с англ., фр., исп., польск. яз. / вст. ст. и сост. Н.Д. Арутюновой; под общ. ред. Н.Д. Арутюновой и М. Журинской. – М.: Прогресс, 1990. – С. 358–386.
8. Blumenberg, H. Paradigmen zu einer Metaphorologie / H. Blumenberg. – Bonn: Bouvier, 1960. – 147 p.
9. Аристотель. Поэтика // Аристотель. Сочинения: в 4 т. / пер. с древнегр. / под общ. ред. А.И. Доватура. – М.: Мысль, 1984. – Т. 4. – С. 669.
10. Гусев, С.С. Метафора в языке и тексте / С.С. Гусев // Новая философская энциклопедия: в 4 т. – М.: Мысль, 2010. – Т. 2. – С. 548–549.
11. Даршакова, Н.А. Изобразительная метафора как средство отражения действительности / Н.А. Даршкова // Вісник ЛНУ імені Тараса Шевченка. – 2013. – № 10(269). – Ч. 1. – С. 162.
12. Мерло-Понти, М. Око и дух / М. Мерло-Понти. – М.: «Искусство», 1992. – 64 с.
13. Арутюнова, Н.Д. Метафора и дискурс / Н.Д. Арутюнова // Теория метафоры. – М.: Прогресс, 1990. – С. 5–32.
14. Ортега-и-Гассет, Х. Две великие метафоры / Х. Ортега-и-Гассет // Теория метафоры: сборник / пер. с англ., фр., нем., исп., польск. яз. / вступ. ст. и сост. Н.Д. Арутюновой; под общ. ред. Н.Д. Арутюновой и М.А. Журинской. – М.: Прогресс, 1990. – С. 68–81.
15. Baldauf, Ch. Metapher und Kognition. Grundlagen einer Theorie der Alltagsmetapher / Ch. Baldauf. – Frankfurt a. M.: Peter Lang, 2002. – 357 s.
16. Иванюк, Б.П. Метафора и произведение (структурно-типологический, историко-типологический и прагматический аспекты исследования) / Б.П. Иванюк. – Черновцы: Рута, 1998. – 252 с.
17. Беспалов, О.В. Архетипы пластического мышления / О.В. Беспалов // Художественная культура. – 2018. – № 2. – С. 34–63.
18. Познание в социальном контексте / отв. ред. В.А. Лекторский, И.Т. Касавин. – М., 1994. – 174 с.

*Паступіў у рэдакцыю 01.07.2020*

Рэпазіторый ВДУ